*Л. У. ЛЯХОВІЧ*

# ПОМНІКІ АРХІТЭКТУРЫ БЕЛАРУСІ Ў СІСТЭМЕ ПАЛІТЫКІ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ (1772 г. – пачатак 30-х гг. XIX ст.)

*Разглядаюцца стан захаванасці помнікаў архітэктуры і іх выкарыстанне ў перыяд ад першага падзелу Рэчы Паспалітай да 30-х гг. XIX ст., падкрэслена спецыфіка адзначанага перыяду як часу паступовай эканамічнай, палітычнай, канфесіянальнай адаптацыі беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі. Адзначаецца, што на той час не была распрацавана сістэма ўліку і аховы помнікаў, нават адсутнічала сама ідэя разглядаць пэўныя пабудовы як помнікі, што выкарыстоўваліся па сваім прамым прызначэнні, хаця праводзіліся пэўныя мерапрыемствы па іх апісанні. На канкрэтных прыкладах паказана, як палітычныя і канфесіянальныя перавагі расійскіх улад непасрэдна адбіваліся на адносінах да замкаў і храмаў.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сацыякультурная трансфармацыя постсавецкага перыяду надала шэраг новых рыс айчыннаму грамадству і выклікала да жыцця адметныя з’явы ў грамадскай свядомасці і культурным развіцці. Зараз адбываецца пераасэнсаванне айчыннай гісторыі, вяртаюцца некалі страчаныя ці забароненыя творы літаратуры і мастацтва, змяняюцца адносіны дзяржавы і рэлігіі. Асабліва патрэбна адзначыць прыцягненне ўвагі грамадства і дзяржавы да такой неад’емнай часткі нашай гісторыка-культурнай спадчыны, як помнікі архітэктуры. На жаль, вялікую іх колькасць напаткаў незайздросны лёс быць знішчанымі, разбуранымі або пастаўленымі на мяжу разбурэння ў выніку дрэннага выкарыстання ці няправільна праведзеных рэстаўрацыйных работ. Мерапрыемствы ў адносінах да айчынных помнікаў архітэктуры, характэрныя для XX ст., былі ў значнай ступені падрыхтаваныя аналагічным вопытам перыяду Расійскай імперыі, які патрабуе аналізу і асэнсавання, асабліва ў сённяшніх умовах разгортвання справы аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

Нягледзячы на актуальнасць і значнасць названых праблем, тэма становішча помнікаў архітэктуры Беларусі падчас яе ўваходжання ў склад Расійскай імперыі не атрымала спецыяльнага разгляду ў айчыннай навуковай літаратуры. У працах такіх айчынных краязнаўцаў, як П.М.Шпілеўскі [14], У.Сыракомля [9], М.В.Без-Карніловіч [2], А.К.Кіркор [4] і іншых, характарызуецца стан захаванасці помнікаў архітэктуры на час апісання, што, безумоўна, з’яўляецца каштоўнай інфармацыяй. Працы В.А.Чантурыя [16; 17], М.АТкачова [10; 11] і іншых змяшчаюць апісанні помнікаў архітэктуры Беларусі на працягу розных гістарычных перыядаў. Пры гэтым патрэбна адзначыць адсутнасць абагульняльных прац, менавіта прысвечаных перыяду Расійскай імперыі, які быў надзвычай важным у арганізацыйным і змястоўным планах. Неабходным з’яўляецца вылучэнне ўзаемасувязі палітычных і рэлігійных пераваг расійскага ўрада ў кантэксце справы выкарыстання і аховы помнікаў архітэктуры на беларускіх землях, а таксама стварэнне перыядызацыі гэтага працэсу.

Адносіны да гісторыка-культурнай спадчыны наогул і помнікаў архітэктуры у прыватнасці заўсёды знаходзіліся ў непасрэднай сувязі з палітычнымі, ідэалагічнымі і рэлігійнымі арыенцірамі ўлады ў канкрэтную эпоху. У дадзеным кантэксце перыяд 1772 г. – пачатку 1830-х гг. у айчыннай гісторыі мае шэраг спецыфічных рыс. З 1772 г. пачаліся паступовае ўключэнне беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі і сацыяльна-эканамічная, палітычная, культурная, рэлігійная адаптацыя грамадства былой Рэчы Паспалітай да Расійскай імперыі. Гэты працэс патрабаваў памяркоўнасці і абачлівасці з боку ўлад Расіі. І Кацярына II, і Павел I, і Аляксандр I не жадалі правакаваць сацыяльныя і рэлігійныя канфлікты на новых тэрыторыях. З прыходам да ўлады Мікалая I, асабліва пасля паўстання 1830–1831 гг., быў узяты паслядоўны і жорсткі курс на дамінаванне праваслаўя і русіфікацыю.

Сацыяльныя, палітычныя, рэлігійныя і іншыя змены непасрэдна закранулі помнікі архітэктуры, у першую чаргу замкі і храмы. На той час яны выкарыстоўваліся з утылітарнымі мэтамі, і помнікамі ў сучасным разуменні не лічыліся. На іх паўплывалі

змяненні іх функцыянальнага і ідэалагічнага прызначэння, што мела далёкія наступствы. Пры гэтым толькі ў пачатку 1830-х гг. робяцца першыя спробы рэгістрацыі і рамонту архітэктурных помнікаў [1], хаця замалёўкі і апісанні былі і раней. Перыяд 1772 г. – пачатку 30-х гг. ХІХ ст., такім чынам, можа быць вызначаны як час выкарыстання помнікаў архітэктуры ў новых умовах і іх эпізадычнага апісання. Адзначым, што пры гэтым яшчэ не існавала сістэма ўліку і аховы.

Пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі на іх быў праведзены тэрытарыяльна-адміністрацыйны падзел па расійскім узоры. Для ўладкавання меж губерняў, а таксама ў сувязі з гаспадарчымі і ваеннымі патрэбамі ўзнікла неабходнасць апісання, вымярэння і картаграфавання тэрыторый. Напрыклад, на працягу 1772–1774 гг. былі складзены два камеральныя апісанні – на ўсходнебеларускую тэрыторыю і казённыя вёскі. У 1783–1785 гг. у Магілёўскай і Полацкай губернях было праведзена генеральнае межаванне, якое скасавала папярэднія правы на валоданне зямлёй і дакументальна афармляла правы новай улады на далучаныя землі [3, с. 50]. Дадзеныя меры былі пазітыўнымі ў справе назапашвання даных аб архітэктурных аб’ектах на апісаных тэрыторыях.

У адзначаны перыяд змяняўся статус шэрага гарадоў на беларускіх землях, што ў перспектыве паўплывала на ўзровень іх добраўпарадкавання і стан будынкаў. Гарады падзяляліся на губернскія, павятовыя і заштатныя. У гэтым сэнсе захавалася значэнне Вільні як агульнага цэнтра Беларусі і Літвы. Браслаў, Брэст, Мсціслаў і Навагрудак атрымалі статус павятовых гарадоў. Старажытныя Полацк і Слонім, першапачаткова вызначаныя як губернскія, таксама сталі павятовымі. Нясвіж нядоўга быў павятовым горадам і перайшоў у разрад заштатных. Расійскія ўлады праводзілі выкуп у казну прыватнаўласніцкіх гарадоў, і да канца 30-х гг. ХІХ ст. толькі 5 з 43 гарадоў Беларусі заставаліся прыватнаўласніцкімі. Потым яны былі выкуплены: у 1843 г. – Ашмяны, у 1846 г. – Слуцк, у 1850-я гг. – Друя, Сянно і Нясвіж [3, с. 128].

На стан замкаў і іх заняпад і разбурэнне істотна паўплывала забарона магнатам трымаць свае войскі і крэпасці, хаця некаторыя замкі і дагэтуль паступова страчвалі сваё абарончае значэнне. Акрамя таго, патрэбна абавязкова ўлічваць разбуральную сілу войн і пажараў. Так, Крэўскі замак паступова страчваў сваё значэнне як абарончы пункт. У XVIII ст. была значна разбурана вялікая вежа, дах і перакрыцці праламіліся, абвалілася частка ўсходняй мяжы. У 50-я гг. XIX ст. Крэўскі замак замаляваў Н.Орда [8, с. 16–17].

Тыповым ва ўмовах адсутнасці ідэі аховы помнікаў быў лёс Навагрудскага замка. Яшчэ ў XVII ст. вежу разбурылі, а будаўнічы матэрыял скарысталі на мураваны млын – вятрак. У 1802 г. гродзенскі губернатар Бенігсан даў дазвол навагрудскаму гараднічаму Скалону разабраць рэшткі замкавых веж, каб вымасціць каменем вуліцы горада. Відаць, работа ішла марудна, таму што ў 1828 г. у данясенні Літоўска-Гродзенскаму губернскаму праўленню паведамлялася, што ў Навагрудскім старажытным замку яшчэ ёсць “две башни, довольно крепкие, немного сверху поврежденные, состоящие в ведомстве Новоградской экономии” [10, с. 21]. Працэс разбурэння працягваўся і далей.

У заняпадзе, хаця і не такім глыбокім, знаходзіўся Нясвіжскі замак. У 1792 г. ён здаўся расійскім войскам. Некаторы час улічвалася тое, што замак можа яшчэ “учинить изрядное сопротивление”, хаця “город, окружающий земляной вал, весьма ненадежен” [11, с. 23]. Падчас вайны 1812 г. Нясвіжскі замак быў разрабаваны. Дамінік Радзівіл падаўся да Напалеона і 11 лістапада 1813 г. памёр у Францыі. На ім перапынілася лінія нясвіжскіх ардынатаў. Указам Аляксандра І ад 24 лютага 1814 г. нясвіжская ардынацыя была перададзена князю Антонію Радзівілу. Малалетняя дачка Дамініка Радзівіла князёўна Стэфанія, якая пазней выйшла замуж за князя Людвіка Вітгенштэйна, знаходзілася пад апекай. Для ўрэгулявання спраў велізарных радзівілаўскіх уладанняў была створана камісія, якая працавала ў Вільні да 1838 г. [9, с. 148].

Мірскі замак у XVIII ст. двойчы трапляў у зону ваенных дзеянняў. У 1706 г., падчас Паўночнай вайны, яго спустошылі і спалілі шведы, а ў 1794 г., падчас паўстання Т.Касцюшкі, узялі ў аблогу і разбурылі рускія войскі А.В.Суворава. Гарадскія ўмацаванні спынілі сваё існаванне ў канцы XVIII ст. Віленская брама і Гарадскі вал апошні раз згадваюцца ў 1794 г. [11, с. 41]. Ледзь адноўлены замак зноў быў разбураны падчас вайны 1812 г. Тут адбылося сутыкненне рускіх з французамі і палякамі. “…26 июня произошла

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

страшная стычка казаков атамана Платова с корпусами Вандама, Понятовского и Латур-Мобура, прикрывавшего вестфальского короля, спешившего в Новогрудок. Казаки грянули на отряды поляков и загнали их в Мир, где некоторые спрятались в замке. Тут-то ожесточенные против мятежников русские взорвали Мирский замок; неуспевшие спрятаться поляки, бросив французские отряды, побежали к Новогрудку…” [14, с. 84].

Слуцкі замак на працягу XVIII ст. быў у добрым стане, і ў 1780 г. рускія афіцэры, якія складалі тапаграфічнае апісанне Слуцка, адзначылі непашкоджаны стан яго ўмацаванняў, у тым ліку чатырох брам горада. Аднак апынуўшыся ў глыбіні Расійскай імперыі, замак страціў сваё абарончае значэнне і стаў прыходзіць у заняпад [11, с. 35].

Некаторыя замкі, не выконваючы свайго прызначэння як абарончых аб’ектаў, не толькі былі ў заняпадзе, але і проста разбіраліся на будаўнічыя матэрыялы. Так было з замкам у Ляхавічах, пабудовы якога былі прададзеныя гандлярам і разабраныя [11, с. 101]; Смалянскі замак, які пачаў разбурацца з канца XVIII ст., быў у рэшце рэшт прададзены на цэглу гаспадаром замка сенатарам Сямёнавым [8, с. 23]. Гальшанскі замак яшчэ ў гады Паўночнай вайны быў значна разбураны шведамі, потым часта пераходзіў з рук у рукі, пакуль нарэшце, ужо ў 1880 г., апошні гаспадар замка Гарбанёў не завяршыў яго знішчэнне. Ён узарваў вежы і сцены, а цэглу пусціў на будаўніцтва карчмы. Часткова ацалелі толькі дзве вежы і ўсходняе крыло палаца [ 8, с. 24; 11, с. 111].

На невысокім узгорку над Свіслаччу пры вусці Нямігі стаяў Менскі замак. Ён існаваў да канца XVIII ст., пасля чаго стаў без догляду руйнавацца, а будынкі яго перайшлі ў прыватныя рукі [7]. Разбураліся замкі ў Лідзе [10, с. 31], Полацку, Віцебску, Старым Быхаве [4; 11, с. 89].

У такіх умовах нечакана добра выглядаў Петрыкаўскі замак, які, згодна інвентару 1810 г., меў абарончы роў і драўляны мост перад яго двух’яруснай уязной брамай, а двайныя палотнішчы дзвярэй зачыняліся на засаўкі і крукі. Пры гэтым гараджане, як і раней, неслі начную вахту, зберагаючы горад ад агню [11, с. 121]. На жаль, толькі адзінкавыя замкі дабудоўваліся, як гэта было з замкам у Гародні [16, с. 41]. І зусім удалым і ў сваім родзе адзінкавым падаецца лёс замка ў Горках. Замак страціў сваё ваеннае значэнне, у ім быў змешчаны памешчыцкі маёнтак, які ў 1840 г. стаў базай для Горы-Горацкай земляробчай школы. У 1848 г. на яе аснове ўзнікла першая ў Расійскай імперыі вышэйшая аграномічная ўстанова – Горы-Горацкі земляробчы інстытут [11, с. 101].

Каталіцкія і уніяцкія храмы былі тымі архітэктурнымі помнікамі, на статусе якіх непасрэдна адбіліся рэлігійныя змены на беларускіх землях.

Пры ўключэнні ў склад Расійскай імперыі Вялікага княства Літоўскага на яго тэрыторыі пражывалі каля 39% уніятаў, 38% католікаў, 10% іудзеяў, 6,5% праваслаўных, 4% стараравераў, 2,5% пратэстантаў, мусульман і караімаў [3, с. 67]. У такіх умовах палітыка верацярпімасці была цалкам мэтазгоднай. Магнаты і значная частка шляхты былі каталікамі, і новым уладам нельга было абвастраць з імі адносіны. Таму каталіцкаму насельніцтву дазвалялася свабодна выконваць свае абрады, за касцёламі і кляштарамі была пакінута іх маёмасць [15, с. 17], аднак не дазвалялася схіляць іншых да пераходу ў каталіцызм. На тэрыторыі былога ВКЛ дзейнічаў забаронены ў 1773 г. ордэн езуітаў, у 1789 г. Павел І дазволіў дзейнасць ордэна трапістаў [12]. На беларускіх землях праводзілі сваю дзейнасць базыліяне, бернардзінцы, дамініканцы, кармеліты, піяры і іншыя манаскія ордэны. Паўлаўская эпоха названа нават “каталіцкім рэнесансам” [5] за прыхільнасць імператара да каталіцкіх і рыцарскіх традыцый. Палітыку Аляксандра І на беларускіх землях у гістарычнай літаратуры характарызуюць як “узмоцненую паланізацыю” [12], ці “паланізацыю ад імя рускага цара” [15, с. 28], улічваючы ліберальныя ідэі цара і асабістыя сувязі членаў імператарскай фаміліі з польскай арыстакратыяй.

Тым не менш урад ніколі не змяншаў прыярытэту праваслаўя, якое павінна быць усталявана і на новых тэрыторыях. Пры гэтым неабходна было ўлічваць, што на Віленшчыне і Гродзеншчыне праваслаўе амаль адсутнічала, а на Віцебшчыне і Міншчыне было нешматлікім, не гаворачы аб цяжкім матэрыяльным стане праваслаўнай царквы і яе вернікаў і адсутнасці добра адукаваных праваслаўных свяшчэннікаў [3, с. 67].

Павялічыць колькасць праваслаўных вернікаў можна было за кошт уніятаў. Уніяцтва спавядалі сяляне, мяшчане, дробная шляхта, якія не ўяўлялі пагрозы для расійскіх улад. На працягу 70-х гг. XVIII ст. магілёўскі праваслаўны епіскап Георгій Каніскі не раз

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

паведамляў Кацярыне II аб жаданні некаторых уніяцкіх святароў і прыходаў перайсці ў праваслаўе. У 80-я гг. расійскія ўлады дазволілі праваслаўным святарам займаць месцы ва уніяцкіх прыходах, і да праваслаўя былі далучаныя амаль 413 тыс. прыхаджан, у асноўным з прыходаў, дзе ўладальнікамі сталі рускія памешчыкі [3, с. 68–69].

Наступны этап пераводу уніятаў у праваслаўе наступіў пасля ўказу Кацярыны II аб ліквідацыі перашкод да вяртання уніятаў у праваслаўную веру ад 22 красавіка 1794 г., для выканання якога на беларускіх тэрыторыях былі выкарыстаны ўсе афіцыйныя рэсурсы. Вынікам прымусу сталі хваляванні уніяцкіх вернікаў, і тады ўлады пакінулі ва уніяцтве тых вернікаў, якія не жадалі змяняць веравызнанне. Жадаючы, відавочна, не паглыбляць абвастрэння адносін з уніяцкай царквой, урад прызначыў у верасні 1795 г. пажыццёвую пенсію тым уніяцкім святарам, што засталіся без прыходаў і не пажадалі выехаць за мяжу [3, с. 68]. Падчас кіравання Паўла I, які дзейнічаў насуперак мерапрыемствам Кацярыны II, уніятаў практычна пакінулі ў спакоі. Тады пачаўся працэс пераходу уніятаў у каталіцтва, і толькі ўрадавыя меры 1803–1807 гг. нейкім чынам прыпынілі гэтую з'яву, але канчаткова пераход з уніяцтва ў каталіцызм быў забаронены ўказам Мікалая I у 1827 г. [14, с. 58]. Такім чынам, палітыка ўлад Расійскай імперыі ў адносінах да каталіцызму і уніяцтва, спачатку памяркоўная, рабілася паступова ўсё больш жорсткай, са стварэннем прыярытэтных умоў для праваслаўя.

Канфесіянальныя трансфармацыі непасрэдна адбіліся на адносінах да культавых пабудоў, і пачалася змена іх уладальнікаў. У першую чаргу каталіцкія і уніяцкія храмы сталі ператварацца ў праваслаўныя, хаця гэты працэс яшчэ не набыў такога размаху, як пасля скасавання уніяцтва. Так, базыліянскі манастыр у Віцебску быў у 1799 г. перададзены праваслаўным, а Успенская царква перайменавана ва Успенскі сабор [8, с. 97–98]; касцёл езуітаў у Пінску ў 1787 г. перайшоў да базыліянаў, а ў 1800 г. перададзены праваслаўнаму мужчынскаму Богаяўленскаму манастыру [8, с. 129–130]. У 1782 г. пажар знішчыў верхнія ярусы веж фарнага касцёла ў Гродне. Пасля аднаўленчых работ 1804–1807 гг. храм быў асвечаны як праваслаўны Сафійскі сабор [8, с. 74]. У 1799 г. касцёл Пінскага езуіцкага калегіума, дагэтуль уніяцкі, перайшоў да праваслаўных [ 6, с. 248].

Перадача храмаў ажыццяўлялася не толькі праваслаўным. У 1820 г. у Расіі быў забаронены ордэн езуітаў. Адпаведна езуіцкі калегіум у Віцебску ў 20-я гг. XIX ст. часова належаў базыліянам [8, с. 96]; будынак Полацкай езуіцкай акадэміі ў 1820 г. перадаецца ордэну піяраў, якія самі валодалі ім да 1830 г. [8, с. 106].

Перадача храмаў і іншых будынкаў другім канфесіям была не горшым варыянтам, таму што яны не пакідаліся занядбанымі, хаця і цаной перабудовы і змены знешняга выгляду. У адваротным выпадку храмы проста гінулі. Так было, напрыклад, з картэзіянскім кляштарам у Бярозе. Пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай узніклі цяжкасці з кіраваннем ордэнам з-за мяжы, і ў 1819 г. была створана мясцовая кангрэгацыя. З мэтай скасавання кляштара расійскія ўлады пачалі ў 1823 г. судовую справу аб дапамозе інсургентам падчас паўстання Касцюшкі ў 1794 г., але абвінавачванне засталося недаказаным. Новай юрыдычнай зачэпкай для закрыцця кляштара стаў удзел манахаў у паўстанні 1830–1831 гг. Пасля канфіскацыі зямель і сродкаў будынак кляштара без вокнаў, падлогі, печаў быў разбураны, а пазней – зруйнаваны [8, с. 133–136]. У 1817 г. быў зачынены Купяціцкі Увядзенскі манастыр, які належаў уніятам, і драўляныя будынкі яго не збераглiся [5, с 173–174]. Адзін з найбольш старажытных манастыроў Беларусі – Лаўрышаўскі – таксама не захаваў сваіх будынкаў пасля скасавання ў 1834 г. [6, с. 176–177].

На фоне рэлігійных змен праваслаўныя храмы працягвалі стабільна функцыянаваць, аднак і для іх не існавала сістэмы ўліку і нагляду; не было ў дадзены перыяд і мэтанакіраванага выдзялення сродкаў дзяржавай. Ва ўсякім разе прыклад царквы Мінскага Петрапаўлаўскага манастыра, капітальна адрамантаванага ў 1793–1795 гг. на сродкі, вылучаныя Кацярынай II, і перайменаванага ў царкву св. Кацярыны, быў выключэннем з агульнага правіла мясцовых і прыватных ахвяраванняў [6, с. 210].

Такім чынам, адносіны да архітэктурных збудаванняў у канцы XVIII – першай трэці XIX ст. былі абумоўлены некалькімі фактарамі. Па-першае, гэта функцыянальная мэтазгоднасць. Заняпад і разбурэнне замкаў могуць быць растлумачаны стратай іх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абарончых функцый і незапатрабаванасцю, асабліва пры частай змене ўладальнікаў. Культавыя пабудовы мянялі сваіх гаспадароў у адпаведнасці з канфесіянальнымі прыярытэтамі, а падставай для матэрыяльнай падтрымкі з боку дзяржавы магла быць прыналежнасць храма да праваслаўя. Па-другое, вельмі важнымі былі наяўнасць, а часцей недахоп ці наогул адсутнасць сродкаў на падтрыманне будынкаў у належным стане. Акрамя таго, уплывала агульная нераспрацаванасць практыкі фіксацыі і аховы помнікаў архітэктуры на беларускіх землях: у адзначаны перыяд такія мерапрыемствы не лічыліся расійскімі ўладамі важнымі.

1. *Алексеев, Л.В.* Археология и краеведение Беларуси XVI в. – 30-е гг. XX в. / Л.В.Алексеев; под ред. академика Б.А.Рыбакова. – Мн.: Беларуская навука, 1996. – С. 53.

2. *Исторические* сведения о примечательных местах в Белоруссии [сост. М.О.Без-Корнилович; подгот. В.Н.Татур]. – Изд. факс. типа. – Мн.: Алфавит, 1995. – 357 с.

3. *Гісторыя* Беларусі: у 6 т. Т. 4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / М.Біч, В.Яноўская, С.Рудовіч [і інш.]; рэдкал.: М.Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн.: Экаперспектыва, 2005. – 519 с.

4. *Живописная* Россия: Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении: Литовское и Белорусское Полесье: репринт. воспроизведение изд. 1882 г. – 2-е изд. – Мн.: БелЭн, 1994. – С. 386–395.

5. *Куль-Сяльверстава, С.Я.* Беларусь на мяжы стагоддзяў і культур: фарміраванне культуры Новага часу на беларускіх землях (другая палова XVIII ст. – 1820-я гады) / С.Я.Куль-Сяльверстава; навук. рэд. П.І.Брыгадзін. – Мн.: БДУ, 2000. – С. 62.

6. *Рэлігія* і царква на Беларусі: энцыкл. давед. / рэдкал.: Г.П.Пашкоў [і інш.]; маст. А.А.Глекаў. – Мн.: БелЭн, 2001. – 368 с.

7. *Смоліч, А.* Геаграфія Беларусі / А.Смоліч. – Мн.: Беларусь, 1993. – С. 241.

8. *Страчаная* спадчына / Т.В.Габрусь [і інш.]. – Мн.: Беларусь, 2003. – 351 с.

9. *Сыракомля, У.* Вандроўкі па маіх былых ваколіцах: успаміны, даследаванні гісторыі, звычаяў / У.Сыракомля; пер. з польск. мовы, прадм., камент. К.Цвіркі. – Мн.: Маст. літ., 2002. – 205 с.

10. *Ткачоў, М.А.* Замкі Беларусі / М.А.Ткачоў. – Мн.: Полымя, 1977. – 84 с.

11. *Ткачоў, М.А.* Замкі і людзі / М.А.Ткачоў; пад рэд. Г.В.Штыхава. – Мн.: Навука і тэхніка, 1991. – 184 с.

12. *Французская* рэвалюцыя і лёсы свету: матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., прысвечанай гадавіне Французскай рэвалюцыі (1789–1799 гг.), 21–22 красавіка 1999 г., Мінск / пад рэд. У.С.Кошалева, У.Н.Сідарцова; пер. з англ. В.М.Шутавай, фр. К.І.Козака, чэш. Дз.Самахвалава. – Мн.: БДУ, 1999. – С. 91–93.

13. *Цьвікевіч, А.* "Западно-руссизм": нарысы з гісторыі грамадзскай мыслі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. / А.Цьвікевіч; пасляслоўе А.Ліса. – 2-е выд. – Мн.: Навука і тэхніка. – 1993. – С. 13.

14. *Шпилевский, П.М.* Путешествие по Полесью и белорусскому краю / П.М. Шпилевский; предисл., текстол. подгот. и коммент. С.А.Кузняевой. – Мн.: Беларусь, 2004. – 251 с.

15. *Шыбека, З.* Нарыс па гісторыі Беларусі (1795–2002) / З.Шыбека. – Мн.: Энцыклапедыкс, 2003. – 490 с.

16. *Чантурия, В.А.* История архитектуры Белоруссии: дооктябрьский период / В.А.Чантурия. – Мн.: Вышэйш. шк., 1969. – 352 с.

17. *Чантурия, В.А.* Памятники архитектуры и градостроительства Белоруссии. – Мн.: Полымя, 1986. – 240 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ